ВЕДАЙ НАШЫХ

# «Ан&Ан» на праекце «Народны повар»

Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.

Па правілах на тэлевізійнай кухні спаборнічаюць дзве каманды. Канкурэнты Наталлі Юшкевіч і Алёны Кастусевіч – сямейная пара са Слуцка. Удзельнікам выдаецца аднолькавы набор прадуктаў, з якіх роўна за 45 хвілін трэба паспець прыгатаваць простыя і смачныя стравы. Што гатавалі, па ўмовах праекта нашы гераіні да выхаду тэлеперадачы не могуць расказаць, але падзяліцца эмоцыямі і ўражаннямі, якіх вельмі шмат, з задавальненнем згадзіліся.

– Да эфіру мы рыхтаваліся – пераглядзелі некалькі выпускаў ранішняй праграмы «Народны повар». Даведаліся пра некаторыя перавагі экспертаў і вядучага, прадумвалі, які набор прадуктаў можа нам дастацца. І, вядома, мы ехалі не з пустымі рукамі. Вырашылі не везці банкі з варэннем або закаткі. Падышлі больш крэатыўна. Майстры дэкаратыўнай керамікі Віктар і Крысціна Маліноўскія з аг. Уселюб па нашай просьбе зрабілі дзве эксклюзіўныя гліняныя талеркі з лагатыпам перадачы «Народны повар». Адну талерку падарылі ў музей перадачы, а другую распісалі аўтографамі членаў журы, удзельнікаў, гасцей сабе на памяць, – з запалам расказваюць гераіні праекта. – А яшчэ наша зямлячка Наталля Беразоўская змайстравала для кожнага члена журы, групы «Калібры-шоу», вядучага Германа Цітова, госця Алега Гайдукевіча, аўтара ідэі, дырэктара дырэкцыі ранішняга вяшчання тэлеканала АНТ Таццяны Рудакоўскай, рэжысёра і нават для сапернікаў краўтавыя пісьмы – імянныя паштоўкі, а мы напісалі прывітанні-пажаданні на беларускай мове. Асобна для вядучага Германа Цітова мы ўзялі з сабой сушаныя пятрэвіцкія яблыкі, грушы, мелісу, шыпшыну, бо сухафрукты – ласунак для тых, хто за здаровы лад жыцця.

– Шчыра прызнаемся, з самага пачатку ў студыі акунуліся ў добразычлівую атмасферу, і хваляванне, якое не пакідала па дарозе на перадачу, адразу знікла. Шчырае і адкрытае стаўленне да ўдзельнікаў на працягу здымак было з боку ўсёй здымачнай групы. Цікава было пагутарыць з прадзюсарам шоу, а таксама з абаяльным вядучым Германам Цітовым. Мы зрабілі шмат фатаграфій. Таксама ўразіў сам працэс здымак. Гэта вельмі цікавы і незабыўны вопыт. Спадабалася інтэрв'ю, якое бралі пасля заканчэння шоу – адзін на адзін з камерай, – адзначае Алёна Кастусевіч.

– Які будзе набор прадуктаў, з якіх прыйдзецца гатаваць, мы не ведалі зараней. Толькі напачатку перадачы даведаліся, з чаго мы будзем гатаваць. Як сапраўдным гаспадыням, нам не страшна было, бо з любых прадуктаў, што ёсць дома, можна прыгатаваць нешта цікавае і арыгінальнае, – дадае Наталля Юшкевіч. – Гатавалі тое, што любяць родныя, але тут патрэбна было дагадзіць знакамітым экспертам – прафесіяналам сваёй справы і госцю перадачы. А яшчэ ў працэсе гатавання трэба было паспяваць адказваць на пытанні вядучага, расказваць пра сябе, свае кулінарныя перавагі. Не перадаць словамі, колькі жартавалі з вядучым падчас здымак – а гэта мы ўмеем і ў нас добра атрымліваецца. Кулінарны бой, які доўжыўся 45 хвілін, праляцеў імгненна. Пасля завяршэння было лёгкае расчараванне – няўжо гэта ўсё! Хацелася яшчэ экстрыму… Наша каманда «Ан&Ан» у ліку 32 каманд, якія прымаюць удзел у праекце. Упэўнены, што ў нас ёсць усе магчымасці прайсці ў 1/16 і астатнія адборачныя туры і пазмагацца за перамогу.

Паважаныя навагрудчане, давайце разам парадуемся і падтрымаем нашых землячак, каб яны як мага больш маглі здзіўляць сваімі кулінарнымі шэдэўрамі журы і гледачоў, зараджаць пазітывам і дарыць нам добры настрой. А ці пройдзе каманда «Ан&Ан» у 1/16, будзе вядома 5 лютага, пасля выхаду апошняй праграмы першага адборачнага тура. Запрашаем да экрана, глядзіце з задавальненнем і гатуйце з натхненнем! Упэўнены, што ўдзельніцы праекта з радасцю падзеляцца рэцэптамі тых страў, якія гатавалі на праекце.

*А якія стравы Наталля Юшкевіч і Алёна Кастусевіч прадставілі на ацэнку экспертаў, даведаемся разам, калі паглядзім тэлеперадачу «Народны повар» у нядзелю 22 студзеня ў 10.40 у эфіры тэлеканала АНТ.*



**Наталля Юшкевіч і Алёна Кастусевіч падчас здымак тэлеперадачы.**

**В. ПІСАР, «НЖ».**

З НАГОДЫ

# Героі нашага часу

**19 студзеня выратавальнікі Беларусі адзначылі сваё прафесійнае свята. У шэрагі выратавальнікаў ідзе той, хто адважны і гатовы рызыкаваць сабой у імя выратавання чужога жыцця, хто моцны духам, спакойны, але неабыякавы да чужой бяды. Людзі гэтай высакароднай і адважнай прафесіі ў гэты дзень справядліва прымалі самыя шчырыя, душэўныя віншаванні і заслужаныя ўзнагароды.**



**Злева-направа: А. Ляшчынскі, Я. Юч, М. Мянчыцкі, І. Малуха, А. Першукевіч, Р. Мягчыла, Я. Лабачоў, А. Сцянько.**

Урачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню выратавальніка і цырымонія прысягі маладымі работнікамі Навагрудскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях прайшла каля Магілы Невядомага Салдата. На вернасць дзяржаве і народу прысягнулі Яўгеній Дарашкевіч і Павел Грэцкі.

Павіншаваць з прафесійным святам агнеборцаў прыйшлі старшыня Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта Сяргей Чаркоўскі і намеснік старшыні райвыканкама Святлана Каралько, ветэраны службы выратавання.

– Паважаныя работнікі і ветэраны раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, прыміце самыя шчырыя віншаванні з прафесійным святам. Цяжка пераацаніць важнасць і значнасць той справы, якую кожны дзень вы выконваеце. Выратаванне, дапамога і абарона – гэтыя задачы работнікаў МНС маюць найвялікшую сацыяльную і эканамічную, гуманістычную важнасць, – адзначыў у сваім віншаванні Сяргей Чаркоўскі. – Становічы імідж такой магутнай структуры, як МНС, не ўзнікае сам па сабе, яго ствараюць рэальныя людзі, якія сваёй штодзённай гераічнай працай імкнуцца зрабіць жыццё нашага грамадства бяспечным. Экстрэмальныя сітуацыі патрабуюць ад вас, паважаныя выратавальнікі, максімальнай сабранасці, высокай дысцыпліны, увагі, самааддачы. Гэта ўсё аб'ядноўваецца адным словам – прафесіяналізм. Праца і прафесіяналізм навагрудскіх выратавальнікаў, безумоўна, бачныя ўсім. Жадаю вам моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, міру, спакою і душэўнага цяпла, далейшых поспехаў у нялёгкай, але ганаровай службе.

Начальнік Навагрудскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый Максімовіч выказаў словы падзякі работнікам і ветэранам аддзела за прафесіяналізм, самаадданасць, добрасумленнае стаўленне да выканання службовых абавязкаў.

Словы віншавання ў адрас выратавальнікаў у гэты дзень таксама гучалі ад ветэрана службы Святланы Лустач.

У штодзённых зводках службы МНС толькі лічбы, але за кожнай з іх чыёсьці выратаванае жыццё. Сведчаннем прафесіяналізму стала ўручэнне ва ўрачыстай абстаноўцы заслужаных узнагарод.

Ганаровай граматай Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта ўзнагароджаны Мікалай Мянчыцкі і Максім Ганчарык.

Падзякамі Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Рэспублікі Беларусь адзначаны Андрэй Першукевіч, Руслан Мягчыла, Аляксандр Сцянько, Аляксандр Ляшчынскі, Яўгеній Юч.

Чарговыя спецыяльныя званні прысвоены прапаршчыкам унутранай службы Анатолію Маляйковічу і Сяргею Бялевічу, сяржанту ўнутранай службы Аляксею Гаўрашу.

Юбілейны медаль «20 год органам і падраздзяленням па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь» атрымалі Андрэй Першукевіч, Яўгеній Лабачоў, Ірына Малуха, Аляксандр Макарэвіч, Руслан Мягчыла, Аляксандр Шакуля.

Памятны нагрудны знак «165 год пажарнай службе» ўручылі ветэранам пажарнай службы Уладзіміру Ерамею і Артуру Кажамяку.

А таксама нагрудным знакам «За заслугі ў пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» узнагароджаны 20 лепшых выратавальнікаў Навагрудскага РАНС.

Выратавальнікі ўшанавалі памяць герояў МНС хвілінай маўчання і ўсклалі кветкі да Вечнага агню.

**В. ПІСАР, «НЖ».**